■ Спорт-тайм

# ПЕРАМОГА І ЎЧЫНАК, ЯКІ ВАРТЫ ПАВАГІ

**У штотыднёвым спартыўным аглядзе «Звязды» расказваем пра вынікі выступленняў беларускіх спартсменаў на юніёрскім чэмпіянаце Еўропы па лёгкай атлетыцы, Еўрапейскім кубку па дзюдо ў Мінску і чэмпіянаце кантынента па пяцібор'і.**

1. **Нашы лёгкаатлеты заваявалі 7 узнагарод на юніёрскім чэмпіянаце Еўропы ў італьянскім Грасета.** Уладальнікамі залатых медалёў сталі Віялета Скварцова (трайны скачок) і Максім Недасекаў (скачкі ў вышыню). У ходзе цырымоніі ўзнагароджвання Віялеты быў уключаны не беларускі гімн (Босніі і Герцагавіны), з-за гэтага дзяўчына вырашыла пакінуць п'едэстал.



— *Віялета Скварцова зарыентавалася абсалютна правільна, і ўчынак гэты годны, заслугоўвае павагі. Спартсменка праявіла цвёрдасць характару і паказала, што трэба з павагай ставіцца да кожнай краіны і да кожнага атлета,* — заявілі ў Міністэрстве спорту і турызму Беларусі.

Яшчэ пяць разоў нашы спартсмены сталі ўладальнікамі сярэбраных медалёў: Карына Таранда (скачкі ў вышыню), Аляксей Каткавец (кіданне дзіды), Тацяна Шабанава (бег на 3000 метраў з перашкодамі), Аляксандр Шыманові (кіданне молата), Глеб Жук (кіданне дыска).

У агульнакамандным медальным заліку зборная Беларусі заняла 9-е месца, на першым радку — спартсмены з Германіі.

2. **Гаспадары заваявалі 6 медалёў на Еўрапейскім кубку па дзюдо ў Мінску.** На самую вышэйшую прыступку п'едэстала падняліся Ягор Варапаеў (вагавая катэгорыя — 90 кг) і Уладзіслаў Цярпіцкі (звыш 100 кг). Лідар сусветнага рэйтынгу Марына Слуцкая (звыш 78 кг) саступіла ў фінале і заваявала сярэбраную ўзнагароду турніру. Нагадаем, у першы дзень турніру «золата» заваявала Дар'я Скрыпнік (52 кг). На трэцюю прыступку п'едэстала ўзышлі Даніэла Казанай (63 кг) і Дзмітрый Мінькоў (66 кг).

У агульнакамандным заліку беларускія дзюдаісты занялі першае месца. У турніры прынялі ўдзел каля 400 спартсменаў з 52 краін. Адзначым, што спаборніцтвы ў Мінску сталі праверкай сіл перад галоўным стартам сезона — чэмпіянатам свету, які пройдзе з 28 жніўня па 3 верасня ў Будапешце.

3. **У Мінску завяршыўся чэмпіянат Еўропы па сучасным пяцібор'і.** У медальный скарбонцы беларускай зборнай дзве ўзнагароды — «золата» Анастасіі Пракапенкі ў асабістым заліку і «бронза» ў жаночай эстафеце, якую заваявалі Кацярына Арол і Тацяна Халдоба.

У мужчынскіх спаборніцтвах найлепшым з квартэта пяціборцаў стаў Павел Ціханаў, які набраў 1410 балаў, гэта 11-е месца.

4. **Ягор Герасімаў стаў пераможцам турніру President's Cup у Астане (прызавы фонд — $125 тыс.)** У фінале ён абыграў Міхаіла Кукушкіна з Казахстана — 7:6 (11:9), 4:6, 6:4. Сёлета да перамогі ў Астане Ягор Герасімаў выйграў яшчэ 3 турніры — ва ўзбекскіх Бухары і Каршы, а таксама французскім Сен-Брые.

5. **На XXIII летніх Дэфлімпійскіх гульнях у турэцкім Сасмуне дзве залатыя ўзнагароды заваявала плыўчыха Аксана Петрушэнка, якая выйграла заплыў на 200 м і 50-метроўку брасам.** Эстафетная каманда 4х100 метраў вольным стылем стала ўладальніцай «серабра». Беларускі таксама былі другімі ў камбінаванай эстафеце 4х100 метраў.

На спаборніцтвах у Самсуне за Беларусь выступаюць 42 спартсмены. Усяго ў цяперашніх Дэфлімпійскіх гульнях прымаюць удзел прадстаўнікі больш чым 100 краін. Спартсмены з парушэннямі слыху спаборнічаюць у 21 відзе спорту, 16 з якіх — індывідуальныя, 5 — камандныя.

6. **Вызначыліся чвэрцьфіналісты Кубка Беларусі па футболе.** «Дняпро» на выездзе адолеў мінскае «Дынама» — 1:0, брэсцкае «Дынама» ў сябе дома перайграла футбалістаў «Гомеля» — 2:1, салігорскі «Шахцёр» разграміў прадстаўніка другога дывізіёна «Оршу» — 6:0. Футбалісты «Віцебска» саступілі «Слуцку» ў серыі пасляматчавых пенальці — 4:2. «Нафтан» уступіў «Крумкачам» — 1:2, «Іслач» абыграла «Гарадзею» — 2:1 (у авертайме), «Нёман» перайграў «Мінск» — 1:0.

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.**
*lobazhevich@zviazda.by*

Даты | Падзеі | Людзі

## 25 ЛІПЕНЯ

**1814** год — англійскі вынаходнік Джордж Стывенсан правёў першае выпрабаванне паравоза.



**1853** год — Мінскае губернскае праўленне і Мінская гарадская дума, разгледзеўшы пытанне «Аб стварэнні пажарнай часці ў Мінску», зацвердзілі каштарыс расходаў на ўтрыманне пажарнай часці ў складзе 51 чалавека. Менавіта з гэтага моманту пачынаецца гісторыя прафесійнай пажарнай службы Беларусі. У 1853 годзе былі арганізаваны пажарныя брыгады ў Віцебску, Магілёве і іншых беларускіх гарадах. У склад першай сталічнай брыгады ўваходзілі брандмайстар, два яго намеснікі і 48 пажарных. У 1890-х у Мінску існавалі ўжо дзве дружыны: гарадская пажарная каманда і Мінская вольна-пажарнае таварыства.

**1897** год — нарадзіўся Антось Галіна (сапр. Міхаіл Міхайлавіч Міцкевіч) (в. Мікалаеўшчына Стаўбцоўскага р-на Мінскай вобл.), беларускі пісьменнік, публіцыст, перакладчык, педагог. Брат Якуба Коласа. Літаратурную дзейнасць пачаў у 1917 годзе. Друкаваўся ў газетах «Вольная Беларусь», «Беларусь». Аўтар апавяданняў і фельетонаў, прысвечаных жыццю сялян і семінарыстаў. У 1940-х выехаў за мяжу. У 1960-я гады пераклаў з царкоўна-славянскай на беларускую мову тэксты малітваў, набажэнстваў, Евангелля. Памёр у 1991 г. у Нью-Ёрку.

**1907** год — расійскі фізік Барыс Розінг падаў заяўку на патэнт на «Спосаб электрычнай перадачы малюнкаў на адлегласць», гэта значыць тэлебачанне.

**1917** год — нарадзіўся Міхаіл Іванавіч Барысенка (в. Глыбоцкае Гомельскага р-на), савецкі навуковец і канструктар у галіне ракетабудавання і касманаўтыкі, член-карэспандэнт АН СССР, доктар тэхнічных навук, прафесар, Герой Сацыялістычнай Працы. З 1946 г. быў галоўным канструктарам у НДІ-885 Міністэрства прамысловасці сродкаў сувязі (Масква), з 1975-га — у Маскоўскім радыётэхнічным інстытуце Міністэрства прамысловасці сродкаў сувязі (дырэктар і галоўны канструктар). Аўтар навуковых прац па касмічнай і лазернай сувязі, стварэнні ракетна-касмічнай радыёэлектронікі. Лаўрэат Ленінскай прэміі, Дзяржаўнай прэміі СССР.

**1930** год — у СССР прынята пастанова ЦК ВКП (б) аб увядзенні ўсеагульнага пачатковага навучання.

**1937** год — нарадзіўся Дзмітрый Браніслававіч Смольскі (г. Мінск), кампазітар, педагог, прафесар, заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі, народны артыст Беларусі. Сярод твораў: оперы «Францыск Скарына», «Сівая легенда», араторыі «Мая Радзіма», «Паэт», «Песні Хірасімы», сімфоніі, інструментальныя канцэрты, вакальныя цыклы і інш. Піша песні, а таксама музыку да кінафільмаў, спектакляў і радыёпастановак. Лаўрэат прэміі Ленінскага камсамола Беларусі, Дзяржаўнай прэміі Беларусі.



**1947** год — у Празе пачаўся І Сусветны фестываль моладзі і студэнтаў. Сусветная федэрацыя дэмакратычнай моладзі вырашыла адзначыць гэтым фестывалем памяць пра падзеі кастрычніка — лістапада 1939 года, калі тысячы навучэнцаў і студэнтаў прынялі ўдзел у дэманстрацыях супраць акупацыі краіны войскамі Трэцяга рэйха, у выніку чаго былі закрытыя ўсе вышэйшыя навучальныя ўстановы краіны, 1850 студэнтаў арыштавана і 1200 з іх пасля адпраўлены ў канцлагеры. Афіцыйнае адкрыццё фестывалю адбылося на Страгаўскім стадыёне ў Празе. Сцяг з эмблемай маладзёжнай федэрацыі быў узняты пад гукі ўпершыню выкананага Гімна дэмакратычнай моладзі. Першы фестываль, які стаў і самым працяглым у сваёй гісторыі (амаль шэсць тыдняў), сабраў больш за 17 000 удзельнікаў з 71 краіны.

Было сказана

**Бернард ШОУ, англійскі драматург:**
*«Жанчына хоча жыць сваім жыццём, а мужчына сваім; і кожны імкнецца звесці іншага з правільнага шляху. Адзін цягне на поўнач, другі на поўдзень; а ў выніку абаім даводзіцца зварочваць на ўсход, хоць абодва не пераносяць усходняга ветру».*

# СЁННЯ

## Сонца

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 5.12 | 21.19 | 16.07 |
| Віцебск — | 4.55 | 21.15 | 16.20 |
| Магілёў — | 5.02 | 21.10 | 16.08 |
| Гомель — | 5.06 | 20.59 | 15.53 |
| Гродна — | 5.28 | 21.33 | 16.05 |
| Брэст — | 5.36 | 21.27 | 15.51 |

## Месяц

***Маладзік 23 ліпеня. Месяц у сузор'і Дзевы.***

## Імяніны

***Пр.** Арсенія, Гаўрылы, Івана, Міхаіла, Сімона, Фёдара.*
***К.** Валянціны, Валянціна, Міхаіла, Рудольфа, Якуба.*



Фота Соф'і КУСЯНКОВАЙ.

# ЗАЎТРА




## УСМІХНЕМСЯ

**Апытанне радыёслухачоў дало нечаканыя вынікі. На першае ж пытанне «Што вы ў гэты момант слухаеце?» 98% апытаных мужчын адказалі: «Жонку».**

— Дарагі, цяпер лета, пара пазбавіцца ад хламу.
— Я не сыду!

**Як выявіць на банкамаце счытвальную прыладу?**

**Падчапіце клавіятуру. Калі пад ёй ёсць яшчэ адна, то гэта хітрыкі махляроў.**
**Калі няма, вы зламалі банкамат.**

— Віця, вазьмі дзіця на футбол!
— Навошта? Яно яшчэ малое.
— Ну а чаго яно гарлапаніць проста так!




Малюнак Паўла ГАРАДЦОВА.

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.
РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. ДРЫНДРОЖЫК, Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), В. МЯДЗВЕДЗЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК.
Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».
НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.
ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмная – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, маркетынгу — 337 44 04, бухгалтэрыі: 287 18 81.
Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.
Тыраж 20.008. Індэкс 63850. Зак. № 2767.
Нумар падпісаны ў 19.30 24 ліпеня 2017 года.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12